Белорусский гос. театр юного зрителя им. Н. К. Крупской
Минск
БССР
ВОЛЬНЫЙ ТРУД
БЕЛОСТОК
5 - ОКТ. 40 г.

# Тэатр Юнага гледача БССР напярэдадні ўсесаюзнага агляду

У квітнеючым прыгожым Беластоку тэатр Юнага гледача заканчвае сваё шасцімесячнае гастрольнае падарожжа па рэспубліцы.

Гэта творчая справаздача тэатра перад сваімі новымі гледачамі прысвечана ўсесаюзнаму агляду дзіцячых тэатраў, які адбудзецца ў Маскве 15 лістапада.

За час гастролей тэатр абслужыў піянераў і школьнікаў гарадоў Бабруйска, Магілева, Мозыра, Гродна, Пружаны і Брэста.

У Беластоку тэатр Юнага гледача будзе працаваць да 15 кастрычніка. Тэатр паказаў юным і дарослым гледачам горада лепшыя свае спектаклі: «Як гартавалася сталь» па аднаіменнаму раману пісьменніка-большэвіка Н. Астроўскага.

Спектакль «Як гартавалася сталь» расказвае аб любімым герої савецкай моладзі Паўле Карчагіне, аб слаўных старонках ленінска-сталінскага комсамола, аб барацьбе нашай маладой рэспублікі з белапольскімі акупантамі і балахоўскімі бандамі.

Другая пастаноўка, якую ўпершыню бачылі юныя гледачы, гэта спектакль «Цудоўная дудка» Віталія Вольскага. Спектакль «Цудоўная дудка» у цікавых мастацкіх вобразах адлюстроўвае думы і імкненні нашага народа, які яшчэ ў далёкія мінулыя часы вёў жорсткую барацьбу супроць драпежных польскіх паноў — сваіх лютых ворагаў. Спектакль багаты народнымі песнямі, музыкай і танцамі. Пастаноўка «Цудоўнай дудкі» карыстаецца вялікім поспехам сярод нашых юных гледачоў: за адзін толькі сезон яна ставілася каля 100 разоў.

Спецыяльнай камісіяй Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР спектакль «Цудоўная дудка» адабраны для паказу ў Маскве на аглядзе лепшых дзіцячых тэатраў Савецкага Саюза.

Аб прыгодах смелай дзяўчынкі Герды, якая, не баючыся ніякіх перашкод, разбойнічай шайкі і злога караля, дасягае сваёй мэты,—расказвае красачны спектакль «Снежная каралева» Е. Шварца, напісаная па матывах казак Андэрсена.

Свае гастролі ў Беластоку тэатр закончыць паказам новай прэм'еры «Казка» Міхаіла Светлова. Гэта адзін з выдатных твораў савецкай драматургіі, прысвечаных нашаму юнацтву. «Казка» паэта Светлова—гэта жыццёвая, рэальная мара нашых людзей, юных патрыётаў краіны соцыялізма.

Спектаклі тэатра Юнага гледача карыстаюцца вялікім поспехам у нашых гледачоў. Школьнікі і піянеры заходніх абласцей палюбілі свой тэатр, сваіх актораў. Яны марацъ быць такімі-ж бясстрашнымі большэвікамі, як Павел Карчагін, як смелы і адданы народны герой пастух Янка з «Цудоўнай дудкі», які аслабаняе сялян ад панскай няволі.

Зараз калектыў тэатра Юнага гледача БССР з вялікім творчым натхненнем рыхтуецца да свайго свята — Усесаюзнага агляду дзіцячых тэатраў. Будзе падрыхтавана дзве новых пастаноўкі: п'еса беларускага драматурга М. Таубе «На парозе жыцця» — аб савецкай школе, адначасова калектыў працуе над славутай камедыяй Мальера «Плутні Скапена».

Паказ творчых дасягненняў нашага тэатра ў Маскве разам з 16 лепшымі дзіцячымі тэатрамі Савецкага Саюза з'яўляецца вялікай чэсцю для маладога калектыва тэатра Юнага гледача БССР ім. Н. К. Крупскай.

**Вл. Стэльмах.**